# Дагавор Гвадалупе-Ідальго і палітычныя кампрамісы 1850-х гадоў як фактары развіцця пытання аб рабстве ў Злучаных Штатах Амерыкі

*Ермакоў Я. С., студ. III к. ГДУ ім. Ф. Скарыны,*
*навук. кір. Чаропка С. А., канд. гіс. навук, дац.*

Грмадзянская вайна ў ЗША і сэцэсія паўднёвых штатаў з'яўляліся прамым адлюстраваннем розных супярэчнасцей, якія развіваліся з самага пачатку існавання краіны. Сярод іх асобна можна вылучыць палітычныя супярэчнасці, на рзвіццё якіх паўплывалі як знешнія, так і ўнутраныя фактары. Ніжэй мы разгледзім гэта на прыкладах амерыкана-мексіканскага міру 1848 г. і палітычных кампрамісаў 1850-х гг.

Дагавор Гвадалупе-Ідальго і палітычныя кампрамісы 1850-х гг. у гістарычных даследаваннях разглядаліся асобна. Вартыя ўвагі даследаванні расійскіх навукоўцаў І. М. Супаніцкай, А. У. Яфімава і амерыканскага даследчыка Р. Раміні. Аднак амаль ніхто не разглядаў іх у сувязі з пытаннем аб рабстве. Відавочна, што тэма дадзенага артыкула актуальна.

Мір Гвадалупе-Ідальго быў падпісаны 2 лютага 1848 г. Ён завяршыў амерыкана-мексіканскую вайну 1846–1848 гг. Паводле гэтага міра Мексіка прызнавала анэксію Тэхаса і аддавала ЗША землі сучасных штатаў Арызоны, Нью-Мексіка, Невады, Каліфорніі і невялікія раёны сучасных штатаў Калярада і Ваёмінг.  [1, с. 281]. Паўстала пытанне пра статус гэтых тэрыторый. І тут пайшлі рознагалоссі. Здавалася б, ніякіх спрэчных момантаў не павінна было ўзнікнуць, бо Місурыйскі кампраміс строга рэгламентаваў працэдуру прыняцця новых штатаў. Так, у частцы восьмай сказана, што «…на тэрыторыі, якая знаходзіцца да поўначы ад 36° 30' з. ш. і не ўключана ў межы штата (Місуры), назаўжды забараняюцца рабства і прымусовая праца…» [2, с. 157]. З тых часоў у склад ЗША адначасова прымаліся па адным рабаўладальніцкім і адным вольным.

Паўстае пытанне – з якой прычыны пайшлі спрэчкі наконт гэтых тэрыторый? Адказ можна знайсці ў анатоміі рабства. Яно можа існаваць толькі дзякуючы экспансіі, бо працэс экстэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, які праходзіў на Поўдні, спусташаў глебу. Таму для дальнейшага развіцця плантацыйнай гаспадаркі неабходны былі новыя землі. Тым больш, абмежаванне рабства ў будучым выклікала б ізаляцыю паўднёвых штатаў, а гэта не было на руку дэмакратам, бо іх пазіцыі ў сенаце залежалі ад колькасці рабаўладальніцкіх штатаў у ЗША. Праціўнікамі пранікнення рабства на новыя тэрыторыі былі вігі. Іх інтарэсы былі звязаныя таксама з эканомікай. Ужо ў

тыя часы рабства стала тармазіць развіццё агульнанцыянальнай эканомікі і закранаць гандлёвыя інтарэсы Поўначы.

Палітычнае жыццё Злучаных Штатаў да Грамадзянскай вайны можна назваць «кампрамісным» перыядам. Усе палітычныя разнагалоссі вырашаліся з дапамогаю палітычных кампрамісаў па звычаям лібералізму. Таксама ў сітуацыі, якая склалася пасля міру Гвадалупе-Ідальго, на дапамогу прыйшоў чарговы палітычны кампраміс. Яго ў 1850 г. распрацаваў Генры Клей, палітык з Поўначы. Прыняцце кампраміса ішло праз цяжкія палітычныя дэбаты ў Кангрэсе. Сам ён прадугледжваў наступнае: Каліфорнія прымалася ў склад ЗША ў якасці вольнага ад рабства штата, астатнія землі, атрыманыя ад Мексікі, падзяляліся на тэрыторыю Юта і тэрыторыю Нью-Мексіка без удакладнення іх статусу як рабаўладальніцкіх ці вольных тэрыторый [1, с. 299].

Перыяд палітычнай стабільнасці, які забяспечыў Кампраміс 1850 г. працягваўся нядоўга. Ужо ў снежні 1853 г. адбыўся новы палітычны крызіс, звязаны з законапраектам аб утварэнні тэрыторыі Небраска, бо тая знаходзіцца паўночней 36° 30' з. ш. і рабства тут не магло быць адпаведна Кампрамісу 1820 г. Новы кампраміс, біль «Канзас-Небраска» 1854 г., быў прапанаваны Ст. Дугласом, прадстаўніком паўночных дэмакратаў, і прадугледжваў падзел тэрыторыі на ўласна Небраска (поўнач) і Канзас (поўдзень) [3, с. 147–148]. У першым артыкуле гэтага закона адзначалася, што «…Канстытуцыя, і ўсе законы Злучаных Штатаў <...> маюць такую ж сілу і дзеянне ў межах паказанай тэрыторыі Канзаса, як і ўсюды ў межах Злучаных Штатаў, за выключэннем восьмай часткі "Місурыйскага кампраміса", <...> які быў несумяшчальным з прынцыпам неўмяшання кангрэса ў Штаты і тэрыторыі з рабствам...» [4]. Такім чынам, гэты заканадаўчы акт адмяняў Місурыйскі кампраміс 1820 г. і даваў прававую аснову распаўсюду рабства на новыя тэрыторыі. Ён не здолеў вырашыць праблему рабства, а толькі яе ўзмацніў, і быў прычынаю грамадзянскай вайны ў Канзасе.

Мір Гвадалупе-Ідальго, палітычныя кампрамісы 1850 г. і 1854 г. не толькі развілі, але і надалі новую моц пытанню аб рабаўладальніцтве ў ЗША. Яно, пачынаючы з міра 1848 г., стала галоўным пытаннем унутрыпалітычнага жыцця Саюза. Кампраміс 1850 г. толькі адтэрмінаваў канчатковае вырашэнне пытання аб рабстве, а акт «Канзас-Небраска» паказаў, што вырашыць мірным шляхам адно з пытанняў, з-за якога пачнецца Грамадзянская вайна, немагчыма.

**Літаратура**

1. Ефимов, А. В. Очерки истории США от открытия Америки до окончания гражданской войны / А. В. Ефимов. – 2-е изд. – М.: Просвещение, 1958. – 438 с.

2. Хрестоматия по истории Нового времени стран Европы и Америки : в 2 кн. / сост. Д. В. Кузнецов. – Кн. 1. Ч. 2. : XIX в. Внутриполитическое развитие – Благовещенск : Издательство БГПУ, 2010. – 209 с.

3. Remini, R.V. A Short History Of The United States : From The Arrival Of Native American Tribes To The Obama Presidency / R.V. Remini. – New York : Harper Perennial, 2009. – 416 p.
4. Kansas-Nebraska Act; May 30, 1854 // Avalon Project – Documents in Law, History Diplomacy [Electronic resource]. – Mode of access: http://avalon.law.yale.edu/19th_century/kanneb.asp. – Date of access: 25.10.2015.

## Плантацыйная гаспадарка як фактар стрымлівання мадэрнізацыйных працэсаў у Злучаных Штатах Амерыкі

*Ермакоў Я. С., студ. III к. ГДУ ім. Ф. Скарыны,*
*навук. кір. Чаропка С. А., канд. гіс. навук, дац.*

Тэма эканамічнага развіцця Злучаных Штатаў перад Грамадзянскай вайной мае вялікую базу даследаванняў. Аднак тэматыка дадзенага артыкула практычна не распрацавана. Ускосна яе закранула ў сваіх працах расійская даследчыца І. М. Супаніцкая. У нашай краіне гэтай тэматыкай не цікавіліся.

Мадэрнізацыйныя працэсы ў ЗША паклалі падмурак для станаўлення і развіцця індустрыяльнай дзяржавы. Аднак гэтыя працэсы па ўсёй тэрыторыі краіны праходзілі нераўнаважна. Ніжэй мы гэта разгледзім на прыкладзе плантацыйнай гаспадаркі.

Мадэрнізацыя ў ЗША пачалася ў першай палове XIX ст. Яна праходзіла ў тры стадыі – транспартная рэвалюцыя, індустрыялізацыя і інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі. Развіццё гэтых стадый праходзіла па-рознаму на Паўночным Усходзе, Сярэднім Захадзе (Поўнач), і на Поўдні [1, с. 10].

Яшчэ з каланіяльных часоў на тэрыторыі Злучаных Штатаў існавала рабства і плантацыйная гаспадарка. З цягам часу з тэрыторыі паўночных штатаў яны сталі выцясняцца, і пачала развівацца фермерская гаспадарка. Гэта адбывалася дзякуючы асаблівасцям клімату Поўначы, бо ён у спалучэнні з геаграфічнымі ўмовамі не даваў плённа развіць плантацыйную гаспадарку. У рэшце рэшт, Поўнач да сярэдзіны XIX ст. пераадолела залежнасць ад прыроды, пачала аграрную рэвалюцыю і індустрыялізацыю [2, с. 17–18].

На Поўдні, дзе субтрапічны клімат спрыяў развіццю плантацыйнай гаспадаркі, спецыялізаваліся на падрыхтоўцы сельскагаспадарчых культур для знешнега рынку: цукру, рысу, бавоўны і г. д. Аднак сам рэгіён не быў аднародны, у ім выдзяляліся Верхні і Ніжні Поўдні. Іх кліматычныя ўмовы адрозніваліся паміж сабою гадавой тэмпературай паветра і працягласцю вегетацыйнага перыяду. Мадэрнізацыя ў Верхнім і Ніжнім Поўднях праходзіла